Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## ЛЕУЧАНКА Дарафей Цімафеевіч

# ЛЕЎЧАНКА
# Дарафей Цімафеевіч

**(25.10.1911 - 15.08.1941)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся 25 кастрычніка 1911 года у вёсцы Посухаўка Уманскага раёна Чаркаскай вобласці Украіны ў сялянскай сям'і.Бацькі рана памерлі, у сям'і засталося 8 дзяцей. Дарафей Леўчанка працаваў пастухом з дзяцінства.Адукацыя няпоўная сярэдняя. У 1928 годзе пераехаў у Забайкалле, дзе скончыў школу ФЗУ. Працаваў слесарам у чыгуначных майстэрнях горада Улан-Удэ.**

**У Чырвонай Арміі з 1931 года. Служыў Леўчанка на Далёкім Усходзе. Там стаў малодшым камандзірам. У 1935 годзе скончыў Омскую ваенную пяхотную школу. Пасля вучылішча вярнуўся на Далёкі Усход і быў прызначаны камандзірам узвода, затым роты.**

**Удзельнік баёў ля возера Хасан (29 ліпеня - 11 жніўня 1938 года). Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 кастрычніка 1938 года за гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях з японскімі мілітарыстамі, старэйшаму лейтэнанту Леўчанка Дарафею Цімафеевічу прысвоена званне Героя**

Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна, а пасля заснавання знака асобага адрознення яму была ўручана медаль “Залатая Зорка”.

Пасля баёў ля возера Хасан капітан Леўчанка некаторы час камандаваў батальёнам. У кастрычніку 1939 года ён стаў слухачом Ваеннай акадэміі імя М.В.Фрунзе. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у войсках, на заходняй мяжы СССР, дзе стажыраваўся на пасадзе камандзіра стралковага палка. Выводзячы полк з акружэння, адважны афіцэр загінуў у жніўні 1941 года каля вёскі Навасёлкі Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці Беларусі. Пасля вайны прах Д.Т. Леўчанкі перапахаваны ў вёсцы Свіслач Асіповіцкага раёна на ўзгорку Славы.

Загадам Міністра абароны СССР Герой Савецкага Саюза Д.Т.Леўчанка навечна залічаны ў спісы Омскага вышэйшага агульнавайсковага каманднага вучылішча. Пахаваны ў вёсцы Свіслач Асіповіцкага раёна у братскай магіле.



# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**Пасля захопу Маньчжурыі ў 1931 годзе японскія мілітарысты сталі сістэматычна ладзіць правакацыі ў памежных з СССР раёнах.**

**31 ліпеня 1938 года, пасля кароткай артпадрыхтоўкі, японцы атакавалі вышыні Безымянную і Заазёрную ў раёне возера Хасан і захапілі іх. Першымі прынялі бой з самураямі савецкія пагранічнікі. Яны расстрэльвалі варожых салдат з вінтовак і кулямётаў, закідвалі гранатамі, але і самі панеслі страты. Пасля 3-яй атакі ў страі з 11 пагранічнікаў засталося 7.**

**Камандзір роты 119-га стралковага палка старшы лейтэнант Леўчанка першым прыйшоў на дапамогу пагранічнікам. Дасягнуўшы сопкі Безымяннай, рота па загадзе камандзіра з ходу ўступіла ў бой. Дружнай атакай яе воіны разам з пагранічнікамі ачысцілі сопку ад японцаў, хоць на кожнага савецкага байца прыходзілася па 20 самураяў. Ворагі некалькі разоў рабілі атакі на сопку, але савецкія воіны стаялі насмерць. Старэйшы лейтэнант Леўчанка атрымаў некалькі раненняў, але працягваў камандаваць ротай, тройчы вадзіў байцоў у контратакі, падаючы ім прыклад бясстрашнасці. Апынуўшыся падчас адной рукапашнай сутычкі ў асяроддзі 7 японскіх салдат, Леўчанка смела ўступіў з імі ў бой і выйшаў пераможцам. Рота Дзмітрыя Леўчанкі не саступіла ворагу ні адной пядзі савецкай зямлі.**

**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 кастрычніка 1938 года за гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях з японскімі мілітарыстамі, старэйшаму лейтэнанту Леўчанка Дарафею Цімафеевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна.**



# ЛІТАРАТУРА

1. Зимонин, В.П. Герои Хасана / Зимонин, В.П., Кузеленков, В.Н.-- М.:Изда-во “Патриот”,2008. -- С.151-152.
2. Кузнецов, И. И. Первые Герои Советского Союза (1936–1939) / Кузнецов И. И., Джога И. М. -- Иркутск, 1983. -- С. 105–106.
3. Криченивкер, Е. М. Золотые Звезды воинов Бурятии. -- Улан-Удэ, 1968. -- С. 54–57.
4. Левченко Дорофей Тимофеевич[Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru
5. Левченко Дорофей Тимофеевич/ Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru
6. Левченко Дорофей Тимофеевич : персональный сайт. Книга памяти [Электронный ресурс] – Курск. – Режим доступа :http://geroykursk.narod.ru
7. Левченко Дорофей Тимофеевич : неофициальный сайт [Электронный ресурс] / Омское ВОКУ им. М. В. Фрунзе. – Омск, 2003-2014. – Режим доступа : http://omvoku.su/memory/1935/levchenko_dt/0.htm
8. Левченко Дорофей Тимофеевич: официальный сайт изд-ва “Патриот”. Книга

памяти. – М., 1995-2005.- Режим доступа :http://patriot-izdat.ru/memory
9. Они отстояли мир. --Днепропетровск, 1985. С. 156–157.
10. Сакава, Н. Загінулі, кааб жылі мы. Жывём, каб памятаць іх: [пра Дарафея Цімафеевіча Леўчанку, Героя Сав. Саюза, які загінуў ў 1941 г. каля в. Свіслач Асіпов. р-на] / Ніна Сакава // Краязн. газ. -- 2006. -- № 45(снеж.). -- С.6.
11. Шаплюк, И. Памяти героев Хасана: командир роты бесстрашных (1938г.) у о.Хасан Д.Т.Левченко похоронен в д.Свислочь // Асіповіцкі край. -- 2003. -- 16 жн. -- С.2.

